## ТАРЫФНАЯ СТАЎКА МОЖА ПАВЫСІЦЦА, СІСТЭМУ АПЛАТЫ БАЛЬНІЧНЫХ СКАРЭКТУЮЦЬ

**Пра гэта стала вядома ўчора падчас пасяджэння Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, якое прайшло ў Доме прафсаюзаў.**

— Сёлета мы ўжо двойчы павышалі тарыфную стаўку першага разраду — у студзені і ў красавіку. Дзякуючы гэтаму сярэдняя зарплата работнікаў бюджэтнай сферы ў маі дасягнула 3,704 мільёна рублёў. А сярэдні заробак па краіне ўжо наблізіўся да адзнакі ў пяць мільёнаў. Каб крыху скараціць разрыў, і было прынята гэтае рашэнне, — патлумачыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК**. — Сярод іншага, у наступным годзе мы плануем накіраваць на павышэнне зарплат бюджэтнікаў і тыя сродкі, якія былі атрыманы ў выніку аптымізацыі дзяржаўнага сектара.

Прыйдуць змены і ў сістэму аказання адраснай дапамогі. 115 тысяч чалавек атрымалі ў яе рамках ад пачатку года 191 мільярд рублёў. Што і казаць, грошы для бюджэту вялікія. Аднак некаторыя грамадзяне паступова прывыкаюць да дзяржаўных дапамог і зусім не імкнуцца зарабляць на хлеб самастойна, фактычна ператвараючыся ва ўтрыманцаў. Таму Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падрыхтавала праект указа, што абмяжоўвае падставы для выплаты штомесячнай дапамогі працаздольным людзям, якія адносіліся да катэгорыі занятых менш за шэсць месяцаў да даты звароту. Зрэшты, гэта будзе адносіцца і да хранічных беспрацоўных, якія адмаўляюцца ад працаўладкавання ці навучання азам новай прафесіі.

Рэформы закрануць і нядаўна зацверджаны ўрадам новы парадак аплаты бальнічных лістоў. Згодна з пастановай Савета Міністраў, першыя дванаццаць дзён непрацаздольнасці зараз аплачваюцца на 80%, а поўны заробак налічваецца толькі пасля гэтага тэрміну. Аднак такую сістэму моцна крытыкуюць прафсаюзы.

— Я не разумею, што ж такога здарылася ў грамадстве, што ў хворага чалавека трэба адняць дваццаць працэнтаў заробку? — заявіў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід КОЗІК**. — Мы ні ў якім разе не выступаем супраць гэтых новаўвядзенняў, калі чалавек страціў працаздольнасць па сваёй віне, напрыклад, у стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення. Аднак калі зімой на прадпрыемстве быў парушаны тэмпературны рэжым і работнік захварэў менавіта з-за гэтага, то ў чым ён вінаваты?

У сваю чаргу, **першы віцэ-прэм'ер краіны Уладзімір Сямашка** запэўніў, што да канца наступнага тыдня ўрад правядзе неабходныя кансультацыі па гэтым пытанні. Пасля іх нашумелую пастанову скарэктуюць альбо ўвогуле адменяць.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Уборачная-2013

## УРАДЖАЙНАСЦЬ ЗМЕНШЫЦЦА ДА 31 ЦЭНТНЕРА З ГЕКТАРА?

**Менавіта такую лічбу прагназуюць спецыялісты Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Летась сярэдняя ўраджайнасць па рэспубліцы склала 38 ц/га. Памяншэнне абумоўлена шэрагам аб'ектыўных прычын, сярод якіх — празмерна доўгая зіма, што сёлета была ў Беларусі. У асобных рэгіёнах снег не сыходзіў больш за 140 дзён, у той час як стандартны перыяд супакою складае 90 дзён. Гэтую інфармацыю журналістам паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ПАЎЛОЎСКІ.**

Нягледзячы на дажджлівае надвор'е, па краіне ўбрана ўжо больш за 9% пасеваў. У лідарах — паўднёвыя рэгіёны, дзе пакуль што больш суха. Васіль ПАЎЛОЎСКІ падкрэсліў, што ў плане наяўнасці і гатоўнасці тэхнікі, фінансавання работ, забеспячэння паліўна-змазачнымі матэрыяламі, колькасці механізатараў асаблівых праблем падчас сёлетняй уборкі няма.

Пры добрым надвор'і і 10-гадзінным працоўным дні ў гэтым годзе тэмпы ўборкі могуць дасягнуць паказчыка ў 150 тысяч гектараў у дзень. Летась на піку ўборачнай ён быў на 23 тысячы меншым. Усё пры тых жа ўмовах увесь ураджай можа быць сабраны за 21 працоўны дзень.

Па словах намесніка міністра, некаторыя культуры, першапачаткова засеяныя пад корм, могуць быць ўбраны на зерне. Гэта тычыцца, напрыклад, яравога ячменю і кукурузы, якія ў некаторых рэгіёнах ўжо выспелі да патрэбнага ўзроўню. Гэта дазволіць павысіць паказчык сярэдняй ураджайнасці яшчэ на 3-4 ц/га і ў выніку сабраць 9,2-9,4 мільёна тон зерня. Для своечасовай уборкі зерневых дадаткова прыцягнуты 4 тысячы механізатараў. Агульная ж колькасць камбайнераў і вадзіцеляў складае 20,4 тысячы чалавек. На закупку зерневых па дзяржзаказе выдзелена 6,3 трыльёна рублёў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

# «ЖОРСТКІ» ДЭФІЦЫТ ЗДЫМНАГА ЖЫЛЛЯ ЎЗВІНЦІЎ ЦЭНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта могуць быць кватэры з мэбляй, са старой мэбляй ці часткова з ёй, або ўвогуле без нічога. Ва ўсіх гэтых выпадках гаспадары жылля адшукаюць сабе кліентаў. Зараз ідзе барацьба не за кліентаў, якія даюць грошы, а за жыллё.

А вось менавіта свабоднага жылля ў Мінску і не хапае. У дзень да спецыялістаў агенцтва нерухомасці «ПАКАДАН» трапляюць толькі 1—2 новыя кватэры па зразумелым невялікім кошце. Амаль імгненна такое жыллё і здаецца, бо попыт на здымныя кватэры зараз перавышае прапанову ў разы.

Крыху лепшыя па якасці аднапакаёвыя кватэры прапануюцца кліентам ужо па цэнніку ў дыяпазоне ад 440 да 480 і нават да 500 долараў. З такім цэннікам кватэры маюць ужо адносна сучасную мэблю, там ёсць пральная машына і іншая бытавая тэхніка.

У гэтым дыяпазоне цэн здаюцца сярэднія па якасці аднапакаёўкі каля буйных гандлёвых комплексаў і побач з метро. Але і падобных кватэр бізнес-класа ўжо не хапае. У дзень новага паступлення такога жылля зрэдку бывае больш за 3—4 кватэры.

Маленькія кватэры ў цэнтры і аднапакаёвае элітнае жыллё мае цэннік ад 520 да 800 долараў.

### НЕ ХАПАЕ І ДВУХПАКАЁВЫХ КВАТЭР

Мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр у трэцяй дэкадзе ліпеня дасягае 420—450 долараў плюс аплата камунальных паслуг. Бываюць, праўда, і двухпакаёўкі за 380—400 долараў, але гэта ўжо жылыя памяшканні з параметрамі ніжэй за сярэдні ўзровень якасці, або ў тых выпадках, калі вам сапраўды пашанцуе.

Цяпер кватэр з коштам арэнды да 450 долараў таксама не хапае, бо штодзённая прапанова падобнага жылля складае не больш чым 4—5 жылых памяшканняў. Крыху лепшыя па камплектацыі і рамонце двухпакаёўкі прапануюцца ўжо за 500 долараў. Сапраўды ўпакаваныя мэбляй і бытавой тэхнікай двухпакаёвыя кватэры, што знаходзяцца побач з лініяй метро, маюць цэннік ад 600 да 700 долараў. Зразумела, што здымаць такія «залатыя» кватэры могуць далёка не ўсе патэнцыяльныя кватаранты.

Попыт на трохпакаёвыя кватэры зараз не вельмі вялікі. Сярэдні кошт арэнды шматпакаёвак складае зараз каля 500—600 долараў. Часам магчыма адшукаць нават крыху таннейшую трохпакаёўку за 450—480 долараў, аднак тут ёсць адно «але»... Звычайна па такім кошце здаюць шматпакаёўкі вялікіх плошчаў у новабудоўлях, дзе ў кватэры зарэгістраваны максімум адзін чалавек. А гэта значыць, што камунальная плата такога жылля зімой будзе зашкальваць.

**Узнікаюць парадаксальныя сітуацыі, калі гаспадар кватэры паведамляе аб тым, што побач з яго домам ёсць дзіцячы садок і школа, а потым патрабуе, каб у кватарантаў не было дзяцей. Дзіўная сітуацыя...**

### ПАТРАБАВАННІ ДА КВАТАРАНТАЎ СТАЛІ БОЛЬШ ЖОРСТКІМІ

Заяў на арэнду недарагіх кватэр цяпер у агенцтвах нерухомасці стала даволі шмат. Хто гэтыя кліенты? Не, гэта яшчэ не студэнты, хваля якіх чакаецца прыкладна праз месяц. Сёння кватэры арандуюць маладыя сем'і, якія вырашылі жыць асобна ад бацькоў; маладыя спецыялісты, што атрымалі перспектыўную працу ў сталіцы і... актыўныя маладыя людзі, якія маюць добрыя заробкі. Апошнія раней здымалі асобныя пакойчыкі, а зараз яны «кучкуюцца» па некалькі чалавек і здымаюць ужо асобнае жыллё. Гэта рэальная катэгорыя кватэранаймальнікаў, якая не заўсёды задавальняе кватэраздатчыкаў.

Сёлета гаспадары арэндных кватэр сталі больш патрабавальна ставіцца да выбару будучых кватарантаў. Амаль усе гаспадары жадаюць, каб гэта абавязкова была сям'я без малых дзяцей (ці ўвогуле без дзяцей) і без жывёл. Узнікаюць парадаксальныя сітуацыі, калі гаспадар кватэры паведамляе аб тым, што побач з яго домам ёсць дзіцячы садок і школа, а потым патрабуе, каб у кватарантаў не было дзяцей. Дзіўная сітуацыя...

Спадарыня Лукашэвіч паведамляе, што часам сярод гаспадароў здымных кватэр пачынаюць гуляць зусім незразумелыя чуткі. Напрыклад, што калі сям'ю з малым дзіцем афіцыйна аформіць па дагаворы ЖЭСа, то потым узнікнуць пэўныя праблемы з іх магчымым высяленнем нават тады, калі кватаранты не будуць плаціць за арэнду. Такія чуткі не маюць пад сабой ніякай глебы, лічыць Аксана Лукашэвіч. Цяпер у большасці выпадкаў у кватарантаў патрабуюць даведку аб сярэдніх заробках, а ў асобных выпадках — і пашпарт, каб даведацца, што шлюб гэтай сям'і сапраўды зарэгістраваны.

### НОВЫ ТРЭНД НА КАМПАНЬЁНСТВА

За апошні час павялічыўся кошт арэнды і асобных пакойчыкаў у звычайных кватэрах. Сёння асобны пакой у кватэры разам з гаспадарамі каштуе ад 140 да 160 долараў. Можна зняць пакой у кватэры, якую ўжо здымае нейкі грамадзянін. У гэтым выпадку арэндная плата ўсёй кватэры дзеліцца напалову і кошт пакойчыка без гаспадароў будзе ўжо да 250 долараў. Пры арэндзе шматпакаёвых кватэр сістэма кампаньёнства выкарыстоўваецца ўсё часцей студэнтамі. Галоўнае, каб гаспадары жылля былі не супраць таго, калі з іх кватэры арганізуюць інтэрнат.

### ПРАБЛЕМА ДЭФІЦЫТУ ЗДЫМНАГА ЖЫЛЛЯ ПРАЦЯГНЕЦЦА НА ГАДЫ

Аксана Лукашэвіч упэўнена, што сур'ёзны недахоп аб'ектаў прыватнай жыллёвай арэнды будзе назірацца ў Мінску ад 2 да 5 гадоў. І гэта пры ўмове, што ў бліжэйшы час у сталіцы будзе весціся масавае будаўніцтва новых жылых кварталаў.

**Аксана Лукашэвіч прагназуе чарговую хвалю ажыятажнага попыту на здымныя кватэры ў трэцяй дэкадзе жніўня і ў верасні. Магчыма, што тады сярэднія цэны арэнды бюджэтных кватэр павялічацца яшчэ на 50—100 долараў.**

Нават масавае будаўніцтва арэндных дамоў сітуацыю ў прыватным сектары арэнды не выправіць. Справа ў тым, што арэндныя кватэры размяркоўваюцца толькі сярод чаргавікоў або тых спецыялістаў, якія патрэбны гораду. Добра, калі арэндныя дамы знімуць вострую праблему сярод чаргавікоў праз 10—15 гадоў, лічыць наш эксперт.

Калі закрануць бліжэйшую перспектыву з арэндай, то і яна не радуе. Аксана Лукашэвіч прагназуе чарговую хвалю ажыятажнага попыту на здымныя кватэры ў трэцяй дэкадзе жніўня і ў верасні. Магчыма, што тады сярэднія цэны арэнды бюджэтных кватэр павялічацца яшчэ на 50—100 долараў. Гэтае падаражанне справакуюць не толькі студэнты і маладыя спецыялісты пасля ВНУ, але і новыя работнікі буйных супермаркетаў Мінска, упэўнена Аксана Лукашэвіч.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### УЛАСНАЯ ДУМКА

## Не трэба быць занадта сквапнымі

**Так здарылася, што ў свой час карэспандэнт «Звязды» сам на працягу 13 гадоў здымаў кватэру. Кошты на арэнду тады былі зусім іншыя — ад 60 да 120 долараў.**

Мне заўсёды шанцавала з гаспадарамі, якія павялічвалі цэннік толькі праз даволі працяглы час і не вельмі моцна. Сёння мой знаёмы здае двухпакаёўку без мэблі ў новым мікрараёне за 350 долараў. Цэннік арэнды на такое жыллё ў Мінску сёння ўжо істотна павялічыўся, але мой таварыш вырашыў быць чалавекам і кошт не мяняць. Ён лічыць, што ў першую чаргу трэба мець паразуменне са сваім сумленнем, што трэба ўлічваць інтарэсы і праблемы іншых людзей. Нельга ўсё вымяраць грашыма, якія зарабляюцца не працай, а на штучным ажыятажы. Я падтрымліваю яго пазіцыю «на ўсе 100».

А яшчэ мяне абурае той факт, што вялікая колькасць кватэраздатчыкаў займаецца прыватнай арэндай па шэрай схеме і падаткі не плаціць. Тут я нагадаю, што сёлета падатковыя органы арганізавалі амаль 500 праверак па лініі здымнага жылля. Пасля чаго ў бюджэт дадаткова паступіла 283,6 млн рублёў. З пачатку года да 1 ліпеня на ўліку ў інспекцыях Мінска ў якасці кватэраздатчыкаў зафіксавана 40488 падаткаплацельшчыкаў, што на 5184 чалавекі больш, чым за падобны перыяд летась.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## БПЦ АБНАРОДАВАЛА ПРАГРАМУ ЗНАХОДЖАННЯ КРЫЖА АПОСТАЛА АНДРЭЯ Ў МІНСКУ

28 ліпеня ў 23.45 дэлегацыя Эладскай праваслаўнай царквы дастаўляе Андрэеўскі крыж у Мінск на цягніку, пасля чаго святыня прыбудзе ў храм Андрэя Першазванага (вуліца Малініна, 19), дзе будзе знаходзіцца да 7.30. На другі дзень, 29 ліпеня, да 8.00 крыж будзе перанесены ў цэнтр Мінска на Замчышча, да месца літургіі, якую адслужыць Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл разам з кіраўнікамі і прадстаўнікамі іншых памесных цэркваў. Пасля богаслужэння крыж апостала Андрэя будзе дастаўлены ў прыход Усіх Святых (перакрыжаванне вуліц Каліноўскага і Усіхсвяцкай, станцыя метро «Усход»), дзе застанецца да 2 жніўня. Доступ да святыні будзе кругласутачным.

**БЕЛТА.**

## БЕЛАРУСЬ ПРЫНЯЛА ЎСЕ НЕАБХОДНЫЯ МЕРЫ ПА НЕДАПУШЧЭННІ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ АЧС

**Аб гэтым заявіў журналістам кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднага эпізаатычнага бюро па Усходняй Еўропе Казімірас Лукаўскас, перадае карэспандэнт БелТА.**

«Беларусь — гэта прыклад таго, як трэба рэагаваць і працаваць у такой сітуацыі. Мы бачым вельмі вялікія намаганні з боку беларускага ўрада і Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, робіцца вельмі шмат, — адзначыў Казімірас Лукаўскас. — Мы хочам пераняць вопыт Беларусі па барацьбе з афрыканскай чумой свіней і прапаноўваць яго іншым краінам».

Кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднага эпізаатычнага бюро падкрэсліў, што ў краінах, дзе выяўлены ачагі захворвання, у першую чаргу неабходна арганізаваць біябяспеку. «Ферма, дзе знаходзяцца свінні, павінна быць агароджана і закрыта. Ніхто з пабочных асоб не павінен туды пранікнуць», — растлумачыў ён.

Казімірас Лукаўскас прымаў удзел у сустрэчы кіраўнікоў ветэрынарных службаў Беларусі, Расіі і Украіны па выпрацоўцы сумесных мер барацьбы з афрыканскай чумой свіней.

## КАНФІСКАВАНЫ МАТАЦЫКЛЫ НА 392 МІЛЬЁНЫ

**Дзякуючы пільнасці беларускіх мытнікаў, канфіскавана пяць матацыклаў вядомых брэндаў агульным коштам больш як 392 мільёны рублёў.**

— Скончана праверка па факце ўвозу праз рэспубліканскі пункт мытнага афармлення «Урбаны» на тэрыторыю Мытнага саюза грамадзянінам Расіі васьмі новых матацыклаў. «KAWASAKI KXF450», «SUZUKI RMZ250», «KTM SX50», «KTM SX65» — гэтыя матацыклы былі выраблены ў 2012-2013 гадах.

У ходзе праверкі высветлена, што з мэтай бяспошліннага ўвозу гэтых матацыклаў грамадзянінам Расіі ў беларускі мытны орган была пададзена несапраўдная дэкларацыя Себежскай мытні (расійскай. — **Аўт.**) без нумара, якая змяшчае звесткі аб тым, што ўсе матацыклы, якія ён увозіў, вывозіліся з тэрыторыі Мытнага саюза — з Расійскай Федэрацыі ў Латвію. Фактычна з тэрыторыі Мытнага саюза грамадзянінам вывозіліся толькі тры матацыклы, — паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай працы Віцебскай таможні.

У сувязі з чым 5 матацыклаў канфіскавалі. Па гэтым факце праводзіцца далейшая праверка.

## ДЫРЭКТАР ГАСПАДАРКІ... БЕЗ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

У Сенненскім раёне вызвалены ад займаемай пасады дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства, які кіраваў гаспадаркай, не маючы нават агульнай сярэдняй адукацыі. Адбылося гэта пасля адпаведнага прадстаўлення пракурора. Аказалася, што цяпер ужо былы кіраўнік быў прызначаны на сваю пасаду з улікам прадстаўленых дакументаў аб адукацыі (у тым ліку аб вышэйшай), якія не адпавядалі рэчаіснасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Погляд

# ЕЎРАБЮРАКРАТЫЯ ПА-ЛІТОЎСКУ

**Некалькі дзён таму міністр замежных спраў і міністр навакольнага асяроддзя Літвы зрабілі даволі жорсткія заявы, якія тычацца ходу беларуска-літоўскіх перамоў па пытанні будаўніцтва беларускай АЭС.**

Міністр навакольнага асяроддзя Валянцінас Мазуроніс заявіў літоўскаму агенцтву BNS, што «ў дасланых раней адказах Беларусі па Астравецкай АЭС мы бачым шмат пытанняў, якія засталіся без адказу. МЗС даручана перадаць нашу пазіцыю Беларусі, і пакуль няма канчатковых, поўных адказаў, сустрэчы з грамадскасцю не могуць праводзіцца».

Гаворка ідзе пра тое, што, у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі (напрыклад, Канвенцыяй Эспа), краіна паходжання трансгранічнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе абавязана паведаміць суседнім краінам пра дзейнасць, якая падобнае ўздзеянне акажа (у нашым выпадку — пра будаўніцтва і далейшую працу АЭС). З заявы літоўскага міністра вынікае, што Беларусь не падала Вільнюсу поўных адказаў на адпаведныя пытанні.

У гэтым жа духу выказаўся кіраўнік МЗС суседняй краіны, які абвінаваціў Беларусь у невыкананні працэдур Канвенцыі Эспа. «Тое, што яны даслалі, не адпавядае патрабаванням да даных, і такія сустрэчы [з грамадскасцю Літвы] не могуць праводзіцца», — сказаў міністр Лінас Лінкявічус.

Тут узнікае пытанне: чаму для інфармавання беларускага боку аб нібыта недастатковасці пададзенай ёй інфармацыі літоўскія чыноўнікі выбралі літоўскае ж інфармагенцтва, а не звычайную міжведамасную перапіску?

Бо, як нам стала вядома ад крыніц у Міністэрстве замежных спраў Беларусі, усе, менавіта ўсе (!) матэрыялы па ўсіх пытаннях літоўскага боку беларускія ведамствы далі яшчэ ў 2012 годзе, у тым ліку — перакладзенымі на літоўскую мову. І з тых часоў — у адказ ні слоўца. Больш за тое, інфармацыю па ўсіх асноўных пытаннях, прадугледжаных Канвенцыяй Эспа, Беларусь дала яшчэ раней. Але на працягу 2012 года ў літоўскіх калег узнікалі ўсё новыя і новыя пытанні, на якія беларускія ведамствы цярпліва накіроўвалі адказы. На працягу 2013 года 5 разоў (!) Мінск афіцыйна звяртаўся да Вільнюса з просьбай даць адказ на накіраваныя матэрыялы і запрашаў літоўскіх калег да пачатку грамадскіх абмеркаванняў трансгранічнай ацэнкі па ўздзеянні на навакольнае асяроддзе (АУНА) беларускай АЭС. Адказ жа прыйшоў толькі 8 ліпеня 2013 года, калі Вільнюс паведаміў, што паперы ўсё ж такі атрыманы, што яны вывучаюцца і што папярэдні адказ на іх можа быць дадзены не раней канца лета 2013 года. Пры гэтым у вусных перамовах было сказана, што з-за вялікай занятасці ў сувязі са старшынствам Літвы ў ЕС разгляд беларускіх дакументаў зацягваецца.

Іншымі словамі, літоўскі бок проста паклаў паперы ў стол і зацягвае пытанне. Пры гэтым ім парушаюцца палажэнні той самай Канвенцыі Эспа, якая абвяшчае, што «зацікаўленыя Бакі забяспечваюць распаўсюджванне адпаведнай дакументацыі сярод органаў і грамадскасці закранутага Боку ... , а таксама прадстаўленне заўваг кампетэнтнаму органу Боку паходжання, альбо непасрэдна, альбо, калі гэта неабходна, праз Бок паходжання, у разумныя тэрміны да прыняцця канчатковага рашэння датычна запланаванай дзейнасці».







Навошта гэта літоўскаму боку трэба — прыкладна зразумела. Літоўскае МЗС нядаўна заявіла, што ад планаў па будаўніцтве ў самой Літве новай, Вісагінскай АЭС яшчэ ніхто не адмаўляецца і перамовы з японскай кампаніяй Hitachi, якая павінна будзе будаваць літоўскі рэактар, яшчэ працягваюцца (вось ужо які год). Але калі ў рэгіёне з'явіцца Балтыйская АЭС у Калінінградскай вобласці і Беларуская АЭС у Гродзенскай вобласці, будаўніцтва новай літоўскай АЭС будзе ўжо эканамічна немэтазгодным. Таму МЗС нашых суседзяў стараецца як мага даўжэй «цягнуць ката за хвост» у жаданні затармазіць беларускі праект. Дарэчы, у дачыненні да Балтыйскай АЭС Вільнюсам былі прыняты яшчэ больш жорсткія меры, звязаныя з адмовай купляць у будучыні электраэнергію, што выпрацоўваецца на ёй.

Аднак з атамнымі амбіцыямі знешнепалітычнага ведамства Літвы не вельмі згодна насельніцтва краіны, якое на нядаўнім рэферэндуме большасцю галасоў (больш за 60%) выказалася супраць будаўніцтва ў краіне атамнай электрастанцыі. Вынік гэты вымушана была прызнаць легітымным прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ, хоць яна і ўбачыла ў ім «руку Масквы» (папулярны ў апошні час лозунг). Аднак міністра замежных спраў гэта чамусьці не пераканала, ён вырашыў ратаваць праект Вісагінскай АЭС насуперак волі народа (дарэчы, таксама папулярны ў апошні час падыход у еўрапейскай палітыцы).

Будучы юрыстам-міжнароднікам па адукацыі і памятаючы пра няўхільны прынцып добрасумленнага выканання абавязацельстваў, я, шчыра сказаць, быў абураны такімі паводзінамі літоўскіх чыноўнікаў. Але расійскі калега, **кіраўнік Руска-Балтыйскага медыя-цэнтра Ігар ПАЎЛОЎСКІ** *(на фота)* падказаў, што здзіўляцца і абурацца тут якраз няма чаму:

«Гэта тактыка літоўскага боку ўжо была адпрацавана на Балтыйскай АЭС. Абсалютна такое ж жаданне «забалбатаць» тэму, пастаянна абвінавачваючы другі бок у неіснуючых грахах. Адмова ад канструктыўнага дыялогу, галаслоўныя асуджэнні, пастаянная віртуальная апеляцыя да нейкіх «еўрапейскіх стандартаў і каштоўнасцяў» замест сур'ёзнай размовы аб бяспецы — яркія адметныя крокі такой тактыкі. Беларусі трэба рыхтавацца да таго, што на ўсе прапановы правесці канструктыўныя размовы будзе абсалютна істэрычная рэакцыя з літоўскага боку. Адрозненне Расіі ад Беларусі толькі ў адным, што Расія на момант пачатку будаўніцтва не ратыфікавала Канвенцыю Эспа, таму можа спакойна будаваць АЭС, не звяртаючы ўвагі на незадаволенасць Літвы».

Таму зусім карэктным у такой сітуацыі выглядае рашэнне беларускіх улад у ініцыятыўным парадку прызначыць грамадскія абмеркаванні на падставе канчатковай справаздачы аб АУНА беларускай АЭС 17 жніўня 2013 года ў г. Астраўцы з запрашэннем туды літоўскай грамадскасці. Як нам паведамілі ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі, беларускі бок гатовы прыняць да тысячы літоўцаў, прадаставіць ахвотным бясплатныя візы, арганізаваць транспартнае забеспячэнне іх удзелу ў абмеркаваннях. Пасля гэтага мерапрыемства беларускі бок запрашае кампетэнтных літоўскіх прадстаўнікоў на экспертнае абмеркаванне АУНА ў Мінску 20 жніўня 2013.

Мабыць, такі спакойны і карэктны падыход з'яўляецца адзіна правільным у гэтай сітуацыі. Абавязацельствы па міжнародных пагадненнях падлягаюць безумоўнаму выкананню.

**Юрый ЦАРЫК, палітычны аналітык, кіраўнік Беларускай групы развіцця.**

■ На слыху

# КАЛЯ ДОКШЫЦ ЗЛАВІЛІ... ЧУПАКАБРУ?

**21 ліпеня на выгане ля аграгарадка Пруднікі Докшыцкага раёна працаўнікі малочна-таварнай фермы забілі невядомую жывёлу, — паведамляюць мясцовыя СМІ. — Яна кідалася на кароў і цялят, кусала іх за ногі. Яшчэ дзве, большыя па памеры, жывёліны паспелі ўцячы. Забітую істоту забраў на тэрыторыю ветэрынарнай станцыі галоўны ветурач раёна Алесь Салаўёў.**



фота Kraj.by.

Вызначыць від жывёлы не змог ні сам ветэрынар, ні паляўнічыя. Пры гэтым Алесь Салаўёў не ўбачыў ніякай сенсацыі ў знаходжанні такога віду і ўжо спаліў труп.

Паляўніцтвазнаўца мясцовай структуры Таварыства паляўнічых і рыбаловаў, які бачыў забітую істоту, мяркуе, што гэта мутант: «Цяжка сказаць, што б гэта магло быць. Думаю, мутант нейкага віду. Для мяне дык на гіену падобна. Нешта ў ім лісінае, нешта ад янота, нешта ад сабакі».

Па многіх прыкметах істота вельмі падобная да легендарнай чупакабры — невядомай навуцы жывёлы, якая быццам бы нападае на капытных і выпівае з іх усю кроў. Першыя паведамленні пра чупакабру з'явіліся ў 1950-я гады ў Пуэрта-Рыка. Пасля гэтага такія паведамленні пачалі з'яўляцца па ўсім свеце: у Аргенціне, Балівіі, Гандурасе, ЗША, Калумбіі, Чылі і нават у Расіі і ва Украіне. Звычайна за «чупакабру» прымалі мутантаў або змучаных хваробай жывёл іншых відаў.

Дарэчы, гэтая «чупакабра» ў Беларусі таксама не першая. У 2011 годзе непадалёк ад Ліды грыбнікі прынялі за яе... труп звычайнай лісіцы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

## У «ЧУПАКАБРЫ» ВУЧОНЫЯ АПАЗНАЛІ ЯНОТАПАДОБНАГА САБАКУ?

**Невядомая жывёла, забітая ў Докшыцкім раёне, мае ўсе прыкметы маладога янотападобнага сабакі, паведаміў карэспандэнту БелТА загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва і навуковага суправаджэння прыродаахоўных канвенцый Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах» кандыдат біялагічных навук Аляксандр Казулін.**

Фотаздымак невядомай жывёлы, забітай на пашы каля аграгарадка Пруднікі, распаўсюдзілі ў інтэрнэце беларускія СМІ. Звер нападаў на кароў і цялят.

Аляксандр Казулін лічыць, што забіты звер падобны на маладога янотападобнага сабаку. Гэтыя жывёлы нараджаюцца лысымі, поўсцю яны абрастаюць па меры сталення. Верагодна, забітай асобіне не было і года. «Без аховы з шэрсці звер не змог бы выжыць зімой», — дадаў вучоны.

Аднак здзіўляе, што янотападобны сабака раптам стаў нападаць на кароў і цялят, адзначыў Аляксандр Казулін. Па спосабе збору корму янотападобны сабака — тыповы збіральнік, які харчуецца жывёльнай і раслiннай ежай (гэта ў асноўным апалыя плады, ягады). Янотападобны сабака есць мышэй, птушак, жукоў. Нападаць на больш буйных жывёл звер не рызыкуе.

Радзіма янотападобнага сабакі — Усходняя Азія. У 1936 годзе ў Беларусь завезена каля 100 асобін гэтага віду. З той пары колькасць янотападобнага сабакі павялічылася ў шмат разоў. У Беларусі жывёла лічыцца інвазіўным відам.

**БЕЛТА.**